**Юбілейны медаль “100 год дыпламатычнай службе Беларусі”**

Юбілейны медаль «100 год дыпламатычнай службе Беларусі» вырабляецца з металу залацістага колеру і мае форму круга з аблямоўкай.

На вонкавым баку юбілейнага медаля размешчана выява чатырох частак свету (Еўропа, Азія, Афрыка і Аўстралія). У цэнтры выявы Еўропы знаходзіцца кветка васілька сіняга колеру, ад якой радыяльна разыходзяцца прамяні залацістага колеру. У верхняй частцы аблямоўкі размешчаны надпіс «100 ГОД ДЫПЛАМАТЫЧНАЙ СЛУЖБЕ БЕЛАРУСІ», у ніжняй – фрагмент беларускага арнаменту.

На адваротным баку юбілейнага медаля ў цэнтры размешчаны надпіс «МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» у тры радкі. У ніжняй частцы адваротнага боку – дзве лаўровыя галіны.

Медаль пры дапамозе вушка і кольца злучаецца з пяцівугольнай калодкай, абцягнутай муаравай стужкай светла-сіняга колеру з палоскамі чырвонага колеру ў цэнтры і па краях. На цэнтральнай чырвонай паласе – паласа жоўтага колеру. Чырвоныя палосы абрамлены кантам зялёнага колеру.

У аснове сюжэту юбілейнага медаля – падзеі 1917-1920 г., якія адлюстроўваюць важны этап гісторыі беларускага народа – здабыццё дзяржаўнасці, стварэнне дыпламатычнай службы – Народнага камісарыяту БССР па замежных справах. Васілёк – адзін з сімвалаў Беларусі, беларускай нацыі, які адлюстроўвае адкрытасць і шчырасць беларусаў, іх месца на планеце Зямля. Беларускі арнамент – элемент народнага касцюма, які стаў часткай дзяржаўнай сімволікі БССР, а пазней – Рэспублікі Беларусь. Лаўр – сімвал падзякі першым дыпламатам беларускай дзяржавы, сімвал памяці, заслуг і традыцый.

Золата ў геральдыцы азначае сілу і славу, чырвоны, зялёны і белы колеры тоесныя колерам дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь. Светла-сіні колер – традыцыйны колер сферы міжнародных адносін, колер мірнага неба і тварэння.